# Другі Салігорскі будуецца



З кожным днём шырыцца размах работ на будоўлі вялікай хіміі рэспублікі — другім Салігорскім калійным камбінаце. Адначасова ўзводзяцца многія аб'екты. Тысячы кубаметраў маналітнага жалезабетону, дзесяткі тон арматуры ўкладзены пад фундамент абагачальнай фабрыкі. Цяпер тут будуюцца склады руды і канцэнтратаў, блок рамонтна-механічнага цэха. Рыхтуюцца да здачы адміністрацыйныя будынкі і сталовая.

На ўсіх участках людзі працуюць з апярэджаннем графіка. На 140—170 працэнтаў выконвае штодзённа зменныя заданні комплексная брыгада, якой кіруе В. А. Кіркевіч. У красавіку месяцы рабочыя ўклалі пад фундамент шпеневых млыноў 740 кубаметраў бетону. Брыгада паспяхова змагаецца за званне калектыву камуністычнай працы. На будаўніцтве электрападстанцыі добра працуюць такелажніца Марыя Маголіна і каменшчык Уладзімір Выскварка. Цёпла адзываюцца ў калектыве аб цесляру-бетоншчыку Віталію Мікалаевічу Панцялею. Многа і плённа папрацаваў ён на будаўніцтве першага калійнага камбіната, а цяпер вопытны работнік вытворчасці працуе на будаўніцтве фундаментаў пад вакуумпомпы новага прадпрыемства.

Перадавікоў многа на кожным аб'екце, на кожным участку. Увесь калектыў вялікай будоўлі змагаецца за тое, каб першую чаргу прадпрыемства здаць у эксплуатацыю ў будучым годзе.

Нарошчваюць тэмпы і шахтапраходчыкі. Яны ўжо закончылі праходку першага і трэцяга стваюў, на другім ствале дасягнулі гарызонта солей, а на ўчастку першага ствала пачалі праходку штрэкаў. Недалёкі той час, калі ўгнаенні другога Салігорскага калійнага камбіната накіруюць на калгасныя палі.

НА ЗДЫМКУ: брыгада арматуршчыкаў за ўстаноўкай арматуры на будаўніцтве абагачальнай фабрыкі. На пярэднім плане — брыгадзір Г. І. Савасцюк.

Фота П. Наватарава. Фотахроніка БЕЛТА.